Гарадская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма г.Гродна;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
і рэкламы цэнтральнай
бібліятэкі імя А.Макаёнка

# "Жыццё, як бліскавіцы міг..."

## Заслужаны дзеяч культуры Беларусі Л.Д. Ляшэнка: нарыс аб жыцці і творчасці

Гродна, 2009г.

*Кожны дзень жыцця – карціна.*
*Карціна,  намаляваная каляровымі*
*альбо чорна-белымі фарбамі.*
*Пражытыя гады – шматлікія залы,*
*дзе сабраныя гэтыя карціны.*
*У кожнага чалавека – свая галерэя.*
*Эрмітаж, Трэццякоўка, Луўр.*
*Ці сціплы правінцыяльны музей.*
*Залежыць ад таго, якое жыццё пражыў чалавек.*
*Спынімся ля карцін*
*у светлым і прасторным Музеі  жыцця*
*таленавітай і шматграннай Асобы,*
*якая пакінула яскравы след ў айчыннай культуры.*
*Ляшэнка Ларыса Дзмітрыеўна...*
*Спынімся ў маўклівым задуменні*
*каля некаторых карцін яе жыцця.*
*Незвычайных па сюжэце.*
*Насычаных па каларыце.*
*Якія ўражваюць і прымушаюць спыняцца...*
*Менавіта з зорачак такіх лёсаў –*
*неабсяжнае зорнае неба культуры, сузор'е Мастацтва.*



**Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка**  [1914- 2004 гг.]– заслужаны дзеяч самадзейнага мастацтва БССР, балетмайстар, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Ёй прысвячаецца гэты біяграфічны нарыс. Тут сабраны некаторыя палотны з Музею яе жыцця, прысвечанага мастацтву.

*Падарожжа па залах  Музею пачынаецца...*

# Зала №1. "Дзяцінства"

Нарадзілася Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка 14 сакавіка 1914 года ў Вільнюсе.

Бацька яе, Бароўскі Дзмітрый Дзмітрыевіч, вучыўся ў Вільнюсе на юрыдычнам факультэце, а вольны час цалкам аддаваў музыцы. Іграў ён амаль на ўсіх музычных інструментах, да таго ж майстраваў скрыпкі. Асабіста быў знаёмы са многімі музыкантамі, наведваў канцэрты, на якія часта браў з сабою дзяцей, Ларысу і Валю. Адна скрыпка работы Бароўскага Дмітрыя Дзмітрыевіча захавалася ў малодшай дачкі Валі.

Маці, Бароўская Стэфанія Людвігаўна, родам з Беластоку, прысвяціла ўсё сваё жыццё выхаванню дзяцей, займалася хатнімі справамі, сама шыла адзенне дочкам.





Бацька – Бароўскі Дзмітрый Дмітрыевіч     Маці – Бароўская Стэфанія Людвігаўна
Фота пачатку XX стагоддзя



Сястра Валя

Ларыса была старэйшая за Валю на 10 гадоў. З ранняга маленства бацька вучыў яе чытаць, іграць на скрыпцы. Калі Ларысе споўнілася чатыры гады, сям'я пераехала з Вільні спачатку ў бацькіну родную вёску Ульшчына Дзісенскага павета Віцебскай губерніі, затым у горад Яраслаўль. Праз пэўны час з Яраслаўля яны трапілі ў Арэнбург. Адразу пасля рэвалюцыі, калі бацьку давялося служыць у радах Чырвонай Арміі, сям'я Бароўскіх пераехала ў Арол.

У Арле сям'я Бароўскіх жыла ў адным з пакояў былога дома купца Падшывалава, і ў памяці Ларысы Дзмітрыеўны з таго часу застаўся цудоўны сад з вельмі смачнымі і велізарнымі грушамі, падобных да якіх яна нідзе і ніколі потым не бачыла.

Бацька Ларысы працаваў натарыусам, юрысконсультам. Але музыка вабіла яго да сябе з неверагоднай сілаю, і, ў рэшце рэшт, ён канчаткова пакінуў юрыспрудэнцыю і заняўся музыкай. Выкладаў у музычнай вучэльні ў Арле.

Ларыса Бароўская вучылася ў Арлоўскай агульнаадукацыйнай фабрычна-завадской сямігодцы. Па спевах, маляванні, рускай мове і літаратуры атрымлівала "пяцёркі", а па матэматыцы – адны "двойкі". Настаўніца матэматыкі часта казала, што з Ларысы можа атрымацца толькі артыстка.

Менавіта ў Арле ёй давялося атрымаць сваю першую музычную адукацыю. З другога класа адначасова Ларыса вучылася ў школе мастацтваў, дзе акрамя ігры на віяланчэлі, скрыпцы і фартэпіяна, яна асвойвала мастацтва балета.

Адно з самых яркіх  ўспамінаў Ларысы Дзмітрыеўны аб тым перыядзе:

“Сонечны поўдзень у Арлоўскай школе мастацтваў. Вяртаюся з урока ігры на скрыпцы. Спыняюся перад



драўлянымі дзвярыма з празрыстым шклом ўверсе. Мне сем гадоў. Я яшчэ маленькая і не магу зазірнуць у шклянае акенца дзверы. Але я цягнуся, станаўлюся на дыбачкі, чапляюся за ручку. Мне ўдаецца і – о, Бог мой, – там дзяўчынка, якая пырхае на кончыках пальцаў... З крыкам урываюся ў пакой:

- Я таксама хачу так! Навучыце!

- Няхай дзяўчынка пазабаўляецца, - сказаў тады бацька не вельмі задаволенай маме”.

І Ларыса пачала сваю “забаву”, якая доўжылася ўсё жыццё.

Але ж сапраўдных забаў на долю Ларысы выпадала няшмат. Напэўна, усе яны засталіся ў дзяцінстве, калі нават складанейшыя заняткі скрыпкай даваліся без напружання, і мама ніяк не магла зразумець, за што дачцы ставяць “пяцёркі”, калі яна зусім не іграла дома.

А дзяўчынка з першага разу запамінала любую п’есу на слых, пасля праігрывання настаўніцай. Але ўсё ж марыла аб танцах...



З малых гадоў Ларыса вельмі любіла маляваць, захаплялася паэзіяй Пушкіна, Лермантава і іншых паэтаў, а затым сама пачала пісаць вершы.

Дзякуючы ўпартасці і працавітасці дзяўчынкі, развіваліся яе шматлікія здольнасці. Усе яны ярка праявіліся ў раннім дзіцячым узросце.

# Зала №2. "Юнацтва"

У 1931 годзе Ларыса становіцца навучэнкай музычнага вучылішча. Але ўсё не было вырашана адразу: перад тым, як канчаткова паслухацца свайго сэрца і звязаць сваё жыццё з мастацтвам, Ларысе давялося пераадольваць перашкоды лёсу.

Пасля заканчэння сямігодкі Ларыса стамілася стрымліваць сябе і проста збегла з дому ў Іванава, дзе яе адразу прынялі ў тэатр музычнай камедыі. Толькі хвароба бацькі прымусіла бяглянку вярнуцца і "выправіцца" – паступіць у Арлоўскае медвучылішча.

Але хутка і самі бацькі зразумелі: медыкам Ларысе не быць. Адзінае, чаму яна з лёгкасцю навучылася – гэта маляваць рознакаляровыя мікробы, якія навучэнцы разглядалі пад мікраскопам.

У рэшце рэшт, бацька адправіўся з просьбай у аблана, каб Ларысу перавялі ў музычнае вучылішча.

Так Ларыса Бароўская пачала займацца тым, да чаго і цягнулася ўсім сэрцам з маленства: мастацтвам. Менавіта ў асвойванні мастацтва танца і музыкі ўсё давалася ёй лёгка. Ларыса была ўпэўнена, што толькі ў гэтым, яна зможа і павінна дабіцца поспехаў.

Аднойчы ў Арол прыехалі артысты, пастаноўшчыкі і рэжысёры Варонежскага тэатра музычнай камедыі.

Яны прыйшлі на прагляд танцавальных



Навучэнкі музвучылішча [1933 г.]
Ларыса Ляшэнка – на прыступках,ніжні рад справа

здольнасцей навучэнцаў музычнага вучылішча, каб адабраць у сваю трупу некалькі самых лепшых танцораў. Для пастаноўкі вальса “Чароўная Алена” балетмайстар Георгій Георгіевіч Герн адбіраў дваіх выканаўцаў.

Бароўская Ларыса Дзмітрыеўна станцавала вельмі добра і была адразу залічана ў склад трупы артыстаў тэатра музычнай камедыі.



Так пасля заканчэння вучылішча ў 1934 годзе дзяўчына паступіла працаваць у Варонежскі тэатр музычнай камедыі.



“І вобразаў бязмежны акіян...”

Такім чынам, лёс і прызванне Ларысы Ляшэнка быў вызначаны насуперак абставінам – гэта танец. Няважна, якімі шляхамі прыйшоў чалавек у харэаграфію. Галоўнае, каб у яго душы жыла любоў да мастацтва, каб ён адчуваў танец і ўмеў перадаць гэта адчуванне гледачу. Менавіта такім дарам шчодра ўзнагародзіў Гасподзь Ларысу Ляшэнка. І гэты дар яна павінна была аддаць людзям.

# Зала №3.
# “Каханне і выпрабаванні”

У Варонежскім тэатры музычнай камедыі доўгі час Ларыса была на другіх ролях, але ведала напамяць сольныя партыі з ўсіх спектакляў, і, калі аднойчы захварэла салістка, яна без рэпетыцыі станцавала сола ў аперэце “Цыганскі барон”.



Ролі ў тэатры музычнай камедыі



У Варонежскім тэатры музычнай камедыі Ларыса Дзмітрыеўна сустрэла сваё каханне. Яе будучы муж Пётр Філіпавіч быў салістам хору тэатра. Менавіта ў Варонежы ў сям’і Ляшэнкаў нарадзіўся сынок Аляксандр.

Адначасова з каханнем у жыццё прыйшла і бяда. Толькі паспела маладая жанчына парадавацца сямейнаму шчасцю, як атрымала страшную вестку: арыштаваны бацька. Прыгавор раўназначны смяротнаму – дзесяць гадоў без права перапіскі. Доўгія пошукі, бясконцыя паходы ў турму былі бязвыніковыя.

Бацька назаўсёды знік у лагерах сталінскага рэжыму. Толькі ў сярэдзіне 50-х гадоў маці Ларысы атрымала паведамленне аб яго рэабілітацыі і пенсію ў 25 рублёў. А тады, у 1938 годзе, Ларыса забрала маці і сястру да сябе.

Да 1939 года сям'я Ляшэнкаў жыла ў Варонежы.



Сям'я Ляшэнкаў: Пётр Філіпавіч, Ларыса Дзмітрыеўна і Аляксандр

У 1939 годзе па запрашэнню кіраўніцтва Мінскага тэатра музычнай камедыі сям'я пераязджае ў сталіцу Беларусі. Пятра Філіпавіча там чакала галоўная роля ў вядомым спектаклі. З гэтага часу Ларыса Ляшэнка засталася жыць і працаваць у Беларусі.

Магчыма, лёс ніколі не звязаў бы жыццё Ларысы Ляшэнка з Беларуссю. Але здарылася так, што ўсе свае сілы і талент яна аддала служэнню менавіта беларускаму мастацтву.

А тыды, у далёкім 1939 годзе, такое рашэнне, як пераезд у іншую рэспубліку, не здавалася Ларысе канчатковым і не несла для яе адбітак наканавання лёсу.

## Зала №4. "Вайна"

Хутка прыйшло яшчэ адно страшнае выпрабаванне – вайна. У тую пару маладыя супругі працавалі ў Мінскім тэатры музкамедыі. 22 чэрвеня тэатр знаходзіўся ў Брэсце, на гастролях. Адпачываючы пасля спектаклю, артысты тэатра раптам пачулі страшэнныя выбухі. Так Ларысе запомніўся пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

З Брэста трупу тэатра вывезлі ў Беласток. Вайна застала Ларысу разам з хворай маці і трохгадовым сынам на руках. Затым цяжка захварэла сястра Валя. У яе быў туберкулёз. Каб неяк выжыць у час акупацыі, Ларыса Дзмітрыеўна хадзіла па навакольных вёсках, прадавала рэчы, выконвала разнастайную сельскагаспадарчую працу.

Пацягнуліся дні і месяцы акупацыі, калі ад смерці, бывала, выратоўваў толькі цуд. То бохан хлеба, які прыносіць сваячка ў хвіліну, калі трываць мукі голада не хапала сілы, то дапамога ледзь знаёмага паляка, які выратаваў Ларысу ад яўрэйскага гета, куды сабіраліся яе адправіць па даносу таварыша па службе.

Страшна, як выпрабаванні дзеляць людзей на тых, каму ўдаецца ўтрымацца над мяжой падзення, і тых, хто пераступае гэту мяжу без ваганняў. Непрыкметны, спакойны рабочы сцэны "здаў" немцам ледзь не палову трупы тэатра. А пасля вайны, адсядзеўшы дзесяць гадоў у турме, зноў уладкаваўся на тую ж пасаду ў Свярдлоўскім драмтэатры.

Ларыса даведалася аб гэтым, калі прыехала да сяброў у госці. Толькі выпадковасць выратавала абоіх ад ракавой сустрэчы [ніхто не мог адгаварыць Ларысу ад спробы адшукаць і па-свойму пакараць здрадніка]. Але на той час тэатр быў закрыты, калектыў знаходзіўся на адпачынку. І Ларыса Ляшэнка паехала са Свярдлоўска з пачуццём так і не ўстаноўленай справядлівасці.




Вызваленне Беларусі [1943-1944 гг]

Але гэта было пазней. А ў канцы вайны, яе муж і сястра атрымалі павесткі – іх чакала праца ў Германіі. Замест кволай і змучанай хваробай сястры Валі паехала Ларыса. Да Германіі іх, на шчасце, не давезлі. Савецкая Армія адагнала эшалон у Чэнстахова. Маладыя супругі не верылі свайму шчасцю.

Яны вярнуліся ў Беласток, дзе жыла сям’я.

Грошай заўсёды было вельмі мала, а ў цяжкі пасляваенны перыяд не хапала адзення, харчавання. Нават на гастролі ў Мінск артыстцы давялося аднойчы ехаць у тапачках... Ах, якая наіўная адразу пасля вайны была ў яе мара: купіць сабе белыя сапожкі! Нават сын аб гэтым ведаў і абяцаў “Мама, калі я вырасту...”

Ён купіў ёй такія сапожкі ў 1996 годзе. Прыгожыя, падбітыя цёплым футрам. Але вось бяда! Падарунак аказаўся малога размеру. І захоўваліся яны, як сямейная рэліквія, у шафе...

# Зала №5. "Гродна"

Яшчэ ў Беластоку адбылася сустрэча, якая ўнесла змены ў далейшы лёс Ларысы Ляшэнка. Ларыса Дзмітрыеўна і Пётр Філіпавіч пазнаёміліся з Рыгорам Шырмай, які на той час працаваў са сваёй знакамітай капэлай ў Беластоку. Яшчэ 1 лістапада 1939 года Рыгор Шырма атрымаў мандат на стварэнне свайго прафесійнага калектыву. Ён збірае вакол сябе таленавітых спевакоў і многіх былых удзельнікаў хораў і пачынае мэтанакіраваную працу з імі ў Беластоку.



Беларускі ансамбль песні і танца Р.Шырмы.
Беласток,1939 г.

Беларускі ансамбль песні і танца **Рыгора Шырмы** да сустрэчы з Ларысай і Пятром Ляшэнкамі ўжо паспяхова выступаў у 1940 годзе ў Мінску, а ў маі 1941 – на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Пазнаёміўшыся з сям'ёй Ляшэнкаў ў канцы вайны, Рыгор Шырма адразу запрашае Ларысу і Пятра Ляшэнкаў на прагляд і праслухоўванне.

- Куды ты яе бярэш?- здзівіўся нехта з памочнікаў Шырмы, гледзячы на кволую і бледную танцаўшчыцу Ларысу, - Яна ж у цябе на сцэне пераломіцца!

Ларыса не зламалася. Не зламалі яе і частыя хваробы пасляваенных гадоў, калі стомлены і аслаблены арганізм даваў збоі. Дзесяць аперацый давялося перажыць маладой жанчыне. Але Ларыса Ляшэнка ўпарта рэпетыравала, многа выступала.

Разам з калектывам Рыгора Шырмы сям'я Ларысы Ляшэнка пераязджае ў Гродна 15 мая 1945 года.

Такім чынам, Ларыса з мужам Пятром Філіпавічам сталі артыстамі ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам вядомага беларускага фальклярыста і музыканта Рыгора Шырмы: яна - танцоркай, а муж - спеваком хору.



Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка і Іван Маркавіч Хвораст

Калектыў ансамбля пачаў плённа працаваць у Гродна і быў перайменаваны адразу пасля вайны ў Дзяржаўны хор БССР.

У складзе вялікага калектыву Р. Шырмы муж і жонка Ляшэнкі ездзілі з канцэртамі па гарадах вобласці і рэспублікі. Балетмайстрам ансамбля быў апантаны танцор, знаўца і збіральнік беларускіх народных танцаў **Іван Маркавіч Хвораст.**

Праца ў такім высокапрафесійным калектыве была для Ларысы Ляшэнка вельмі добрай школай. Яна дасканала вывучыла тут характар і асаблівасці беларускага народнага танца і вельмі палюбіла яго прыгажосць і адметнасць. Гэту любоў у поўнай меры перадала яна сваім вучням.

Але ў 1946 годзе Рыгор Шырма расфарміраваў танцавальную групу ансамбля. У 1952 годзе капэла паехала ў Мінск без танцораў. Ларыса Ляшэнка засталася ў Гродна.



Чароўнае танга.
Выканаўцы:
Ларыса Ляшэнка і
Іван Хвораст

Два гады яна працавала артысткай ансамбля аперэты горада Баранавічы. З 1947 па 1950 гады была метадыстам абласнога Дома народнай творчасці горада Гродна. Амаль адначасова працавала балетмайстрам і піяністкай у Доме афіцэраў, кіравала танцавальнымі калектывамі ў шматлікіх установах і на прадпрыемствах горада.

З 1949 па 1962 год Ляшэнка Л.Д. вяла заняткі ў танцавальным кружку Гродзенскага Дома піянераў. На піянерскай сцэне былі пастаўлены маляўнічыя дзіцячыя балеты “Піянерскае лета”, “Папялушка”, “Снягурачка”.



Л.Д.Ляшэнка
[у цэнтры] з юнымі
артыстамі
старэйшай групы
Дома піянераў



Кіраўнікі дзіцячых калектываў Дома піянераў [у цэнтры – Ларыса Ляшэнка]. Сяр. 50-х гг.



Выступленні артыстаў Дома піянераў з дзіцячымі танцавальнымі кампазіцыямі ў пастаноўцы Л.Д.Ляшэнка



У газеце “Гродзенская праўда” за 8 мая 1951 года ў артыкуле І. Нісневіча і Р. Пуксты “Аб творчасці пачынаючых кампазітараў Гродзеншчыны” аўтарамі падкрэслены несумненныя кампазітарскія здольнасці Ларысы Ляшэнка: валоданне арыгінальным меладычным мышленнем, добрае адчуванне музычнай формы.

У артыкуле Ларыса Дзмітрыеўна названа кампазітарам, які напісаў многа харавых, сольных і дзіцячых вакальных твораў, частушак, фартэпіянных п’ес. Гэта сведчыць толькі аб тым, што Ларыса Дзмітрыеўна спрабавала сябе ў розных жанрах і відах мастацтва.


У ДАРОГУ

Словы Г. КЛЯУКО — Музыка Л. ЛЯШЭНКА



Адзвінела песня развітання
Каля школы ў апошні раз,
Ты на век запомні гэта ранне,
Гэты светлы непаўторны час.
Мы ідзем сцежынкаю дадому,
Ты рукой кранаеш каласы;
Веру я, ты станеш аграномам,
Буду я ўзводзіць карпусы.

Доўга мы чакалі дня такога,
Калі з першым раннім цягніком
У інстытут паклічa нас дарога
Ад сцежынкі гэтай за сялом.
А цяпер, паслухай, як уранні
Над зямлёй праносяцца гудкі...
Гэта клічуць нас на развітанні
У дарогу нашы цягнікі.

Л.Д.Ляшэнка - кампазітар.
Газета “Гродзенская праўда” [ 24 ліпеня 1953 г.]



Нядаўна ў Мінску праходзіла другая рэспубліканская канферэнцыя самадзейных кампазітараў.

**На здымку:** удзельнікі канферэнцыі (злева направа) **І. Мацін** (Гродна), **Л. Ляшэнка** (Гродна), **Ю. Семяняка** (Гродна), **Г. Галавасцікаў** (Баранавічы), **П. Шэўко** (Баранавіцкая вобласць).

Фото М. Міньковіча.

Фота з газеты Чырвоная змена" за 22 красавіка 1952 г.

З 1950 года Ларыса Ляшэнка дваццаць гадоў працавала выкладчыкам народнага танца Гродзенскага культасветвучылішча. Танцавальны калектыў вучылішча пад яе кіраўніцтвам здабыў славу аднаго з лепшых у горадзе. Ён пабываў з канцэртамі ў Польшчы, удзельнічаў у першым фестывалі моладзі і студэнтаў у Мінску, выступаў на ўсіх святах песні, вечарынах. Асабліва гродзенцам запомніўся вечар балета, праведзены ў 1963 годзе ў гарадскім парку.

За час працы ў вучылішчы Л.Д. Ляшэнка паставіла мноства розных танцаў. Сярод іх – шмат сугучных таму часу. Напрыклад, “Сустрэча на цаліне”, “Кукуруза”, “Вясельная” і іншыя.

Работа ў вучылішчы патрабавала вялікай энергіі і самаадданасці. За чатыры гады навучання юнакі і дзяўчаты павінны былі атрымаць падрыхтоўку клубнага работніка і кіраўніка танцавальнай самадзейнасці. Яны вывучалі класічны, характарны, народны і бальны танцы, тэарэтычныя прадметы – гісторыю балета, касцюма, грыму, музычную грамату. Усе свае веды і любоў да справы аддавала навучэнцам вопытны педагог-балетмайстар Л.Д. Ляшэнка.

## Зала №6. “Нёман”

Працуючы выкладчыкам харэаграфіі ў вучылішчы, шмат увагі, душэўных сіл аддавала Ларыса Дзмітрыеўна моладзі. Але ёй чагосьці не хапала. Пасля работы ў прафесійным калектыве Р. Шырмы, ёй хацелася творчасці ў больш значным аб’ёме. Не хапала работы менавіта са сваім, моцным і перспектыўным калектывам.

У 1957 годзе, калі створаны на 10-месячных курсах культасветработнікаў пры Абласным Доме народнай творчасці часовы танцавальны калектыў не захацеў “разбягацца”, у Ларысы Дзмітрыеўны Ляшэнка і Паўла Аляксандравіча Радаліцкага [будучага першага мастацкага кіраўніка ансамбля] нарадзілася ідэя, каб з навучэнцаў курсаў, з танцораў і спевакоў арганізаваць самадзейны ансамбль песні і танца “Нёман”.

Ларыса Дзмітрыеўна ўзялася за справу. Па ўспамінах Шэвалье Ігара Аляксандравіча, які працаваў доўгі час побач з ёй у культасветвучылішчы, кіраўніцтвам горада ў тыя часы перад работнікамі культуры была пастаўлена задача стварыць такі ансамбль, каб не сорамна яго было адправіць на гастролі ў Польшчу па запрашэнню польскага ансамля “Куркі зялёныя”.

Так на прынёманскай зямлі нарадзілася самабытная цудоўная кветка – народны ансамбль песні і танца “Нёман”, які чаруе людзей сваім прыгожым мастацтвам і да сённяшняга дня. Л.Д. Ляшэнка стаяла ля вытокаў нараджэння славутага калектыву, была яго бяссменным пастаноўшчыкам танцаў доўгія гады.

У народным ансамблі “Нёман” Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка працавала балетмайстрам з 1957 па 1987 гады, затым з 1990 па 1996 гады.

Дэбют новага ансамбля адбыўся на канцэрце ў Гродзенскім гарадскім парку. Нязвыклыя да скаплення гледачоў артысты проста разбегліся са сцэны пасля выканання танца “Крыжачок”. Нават саромеліся выйсці на паклон.




“Нёман” усміхаецца... Усміхаюцца і яго кіраўнікі: мастацкі кіраўнік і дырыжор, заслужаны дзеяч культуры БССР А.С.Чопчыц і балетмайстар, заслужаны дзеяч культуры БССР Ляшэнка Л.Д. [у цэнтры]

А хутка ансамбль песні і танца “Нёман” ужо з поспехам выступаў за мяжой, у Беластокскім ваяводстве. Потым быў удзел у канцэртных праграмах на ХХІІІ з’ездзе КПСС, на з’ездах КПБ, некалькі гастроляў на ВДНГ у Маскве.

Пасля выступлення ансамбля “Нёман” у Крамлёўскім Палацы З’ездаў вядомы кампазітар - песеннік А.Г. Новікаў у адрас гродзенцаў зрабіў наступны памятны надпіс у кнізе водгукаў: “...Ларысе Дзмітрыеўне Ляшэнка з удзячнасцю за вельмі прыгожую і светлую, свежую работу па стварэнню танцаў у гродзенскім калектыве”.

Артыстаў гродзенскага “Нёмана” і ў Зорным гарадку, і ў Палацах культуры завода “Серп і молат”, аўтазавода сустракалі цёпла і гасцінна. Шмат апладысментаў заваявалі выканаўцы “Лявоніхі”, “Бухенвальскага набату”, “Беларускай мяцеліцы”. Горача віталі масквічы салістаў Зіновія Бянько і Марыю Бяйдук, выканаўцаў вакальна-харэаграфічнай экспазіцыі “Колькі ў небе зорак” і фінальнай “Полькі”.

А колькі добразычлівых запісак, прывітальных адрасоў, пажаданняў новых поспехаў атрымалі “нёманцы”! Вось, напрыклад, якую адзнаку атрымалі яны разам з граматай ад удзячных гледачоў Зорнага гарадка: “Прыміце найлепшыя пажаданні творчых поспехаў ад захопленых у палон вашым мастацтвам. Цудоўнае ваша мастацтва, як цудоўная ваша Беларусь! Бывайце здаровыя!”



Канцэрт у Зорным гарадку. Сустрэча “нёманаўцаў” з лётчыкам-касманаўтам П.Р.Паповічам 1964 г.





Знакамітая вакальна-харэаграфічная кампазіцыя “Залатыя каласы” [Пастаноўка Л.Д. Ляшэнка, музыка самадзейнага гродзенскага кампазітара Я.К.Петрашэвіча]

Калі намеснік міністра культуры СССР І.І. Цвяткоў вітаў удзельнікаў ансамбля “Нёман” пасля іх першага канцэрта ў Крамлёўскім Палацы, ён сказаў: “Мы ведаем, што Беларусь багатая на таленты, а сёння мы атрымалі вялікае таму пацвярджэнне”.



НА СНИМКЕ: заместитель министра культуры СССР И. И. ЦВЕТКОВ беседует с участниками ансам «Неман» после концерта в Кремлевском театре.
Фото В. КОСТИНА

Здымак у газеце “Гродзенская праўда” [1964 г., 22 сакавіка]

Паступова забывалася, якім цяжкім шляхам ішоў калектыў да поспеху, як нараджаўся кожны танец, колькі варыянтаў прымалася і адвяргалася, як цяжка было дабіцца дакладнасці малюнка, чысціні і выразнасці выканання.

Для маладых танцораў “Нёмана” былі характэрны высокае выканальніцкае майстэрства, самааддача, непасрэднасць і шчырае захапленне. У выпрацоўцы гэтых якасцяў – нямалая заслуга Л.Д. Ляшэнка. Зразумелы шматгадовы поспех гэтага калектыву. Дзе б ні выступалі “нёманаўцы”, - а яны з гастролямі аб’ездзілі ўвесь былы Саюз, былі і ў Польшчы, Германіі, Літве, Латвіі, Малдавіі, Шры-Ланке, ГДР, Іспаніі, - ім ўсюды горача апладзіравала самая патрабавальная аўдыторыя.

Восенню 1961 года ансамблю песні і танца “Нёман” было прысвоена ганаровае званне “народны”.

Асабліва яркія ўспаміны пакінула ў артыстаў “Нёмана” паездка на Міжнародны фестываль фальклору, які адбыўся восенню 1981 года ў трох гарадах Іспаніі: Ронда, Мурсіі, і Аўеда. Калейдаскоп песень, танцаў, інструментальных і вакальна-харэаграфічных малюнкаў, якія хутка змяняліся, не пакінулі раўнадушнымі іспанскіх гледачоў і гасцей фестывалю. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі менавіта пастаноўкі танцаў Л.Д. Ляшэнка: карагоды, купальскія, вясельныя і дажыначныя танцы і гульні. Ансамбль “Нёман” быў у Іспаніі тады адзіным прадстаўніком мастацтва Краіны Саветаў.




Міжнародны фестываль фальклору [Іспанія, 1981 г.]



Праграму “Нёмана” абмяркоўваюць балетмайстар, заслужаны дзеяч культуры БССР Л.Д. Ляшэнка, хормайстар Г.І.Стрыха, мастацкі кіраўнік ансамбля, заслужаны дзеяч культуры БССР А.С. Чопчыц

# Зала №7. “Вучні”

У 1999 годзе у газеце “Культура” быў надрукаваны артыкул “Ларыса Ляшэнка, чый лёс і прызванне – танец” Таццяны Кухаронак, кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, якая сустракалася з Ларысай Ляшэнка ў яе дома, ва ўтульнай невялікай кватэры на завулку Даватара. Вось ўспаміны Т. Кухаронак з артыкулу: “Вельмі многа і з задавальненнем любіла расказваць яна аб сваіх вучнях, якіх за трыццаць гадоў выхавала і “выправіла ў людзі” не адзін дзесятак. Зараз яны працуюць ужо са сваімі ансамблямі ў розных кутках Беларусі, на Украіне, у Расіі, Польшчы, больш маладыя яшчэ танцуюць у прафесійных калектывах нашай краіны і за яе межамі. Многія з іх часта пісалі сваёй настаўніцы, тэлефанавалі, прасілі парады, дзяліліся сваімі радасцямі і горам. Таму што для некаторых з іх Ларыса Дзмітрыеўна стала другой маці.

Удзячныя вучні з ансамбля “Нёман” [выступленне ў Мінску ў 1962 годзе]



Праз яе рукі прайшлі самыя розныя хлопцы і дзяўчаты са сваімі характарамі, тэмпераментамі, лёсамі, поглядамі на жыццё, – і да кожнага ёй трэба было знайсці свой падыход. Ларыса Дзмітрыеўна дапамагала кожнаму маладому танцору раскрыць свой талент, часта нават насуперак яго жаданню, знайсці такі танец, такі сцэнічны вобраз, у якім бы зіхацелі ўсе бакі даравання канкрэтнага выканаўцы.

На занятках танцавальнай групы Ляшэнка пастаянна прытрымлівалася аднаго метадычнага прынцыпу: “Можна яшчэ не ўмець выконваць, але нельга губляць жаданне навучыцца”.

Прыходзілі да Ларысы Дзмітрыеўны і падлеткі, ад якіх на той час адмовіліся і бацькі, і школа, такія яны былі “цяжкія”. А гэтая жанчына знаходзіла падыход да дзіцячай душы і сэрца, разумеючы добра асаблівасці дадзенага ўзросту – яна давала ім на рэпетыцыі такія нагрузкі, што яны ледзьве дапаўзалі дадому. Якое ўжо пасля гэтага магло быць хуліганства! З некаторых хлопцаў атрымаліся потым вельмі яркія салісты, асабліва ў хуткіх танцах, дзе патрэбны былі спрыт, сіла, “кураж”, як гаварыла Ларыса Дмітрыеўна”.

У Л.Д. Ляшэнка было звыш 500 выхаванцаў! Вось прозвішчы некаторых самых таленавітых вучняў Ларысы Ляшэнка: Е. Губіна, А. Казячая, Н. Султанава, С. Федаровіч, М. Пісьлякоў, Н. Валедава, Л. Франкоўская, З. Маёрава, Т. Сімановіч, Т. Цвяткова, Н. Парахневіч, У. Супоненка і шмат іншых.

У ансамблі “Нёман” раслі сапраўдныя таленты, стварыўшыя пасля свае творчыя калектывы. Як, напрыклад, Слава Федаровіч, якога некалькі разоў выклікалі на “біс” на Крамлёўскай сцэне. Ён па 36 разоў круціў “паветраныя туры” ў танцы “Мяцеліца”. Круціў з такой хуткасцю, што немагчыма было разглядзець яго твар.

Потым Слава Федаровіч кіраваў кіеўскім ансамблем “Чернобрівіца”, які аб’ехаў з гастролямі не адзін дзесятак краін.

А было яшчэ і такое. У 80-я гады амаль усе дзяўчаты ў ансамблі “Нёман” сталі курыць, і ніякія ўгаворы, пагрозы, крыкі не дапамагалі. Ларыса Дзмітрыеўна ўспамінала, што яна была ў адчаі, бо дзяўчаты пачалі хутка стамляцца на рэпетыцыях, знікла нейкая ледзь улоўная праява абаяльнасці падчас выступленняў. І вось тады Ларыса Ляшэнка зрабіла наступнае: апранула бялюсенькую блузку, сабрала ўсіх дзяўчат, закурыла цыгарэту, зацягнулася і выпусціла дым на каўнер сваёй кашулі, які адразу стаў шэра-жоўтым. Моўчкі пастаяла і пайшла. Пасля гэтага амаль усе аматары цыгарэт кінулі гэтую справу. А Ларыса Дзмітрыеўна аб гэтым выпадку сціпла казала: “Мабыць, хвіліна такая добрая надарылася, а я тут ні пры чым”.



Выступленне “нёманаўцаў” на канцэртных пляцоўках пад адкрытым небам [1980-я гг.]



# Зала №8. “Танец”



*“Танец – самае ўзвышанае, самае хвалюючае і самае цудоўнае з ўсіх мастацтваў, паколькі ён не проста адлюстраванне жыцця ці абстрагаванне ад яго, а самое жыццё”.*

Хэўлак Эліс “**Танец жыцця**”

“Не люблю паўтарацца, і ніколі не ставіла танцаў з кніг, а толькі свае, бо гэта цікава”, - гаварыла Ларыса Дзмітрыеўна звычайна. І гэта было так, яна ніколі не паўтарылася.

Цяжка пералічыць і хоць бы коратка ахарактарызаваць усе танцы, пастаўленыя Ларысай Ляшэнка. Іх было каля 200, у тым ліку “Святочны кірмаш”, “Вясна-красна”, “Рассыпуха-полька”, “Сонца яснае ўзышло”, створаныя на рэгіянальным фальклорным матэрыяле Гродзеншчыны, які збіраўся ў экспедыцыях па родным краі. Ларыса Дзмітрыеўна часта выязджала ў вёскі, дзе запісвала народныя танцы, падбірала здольных танцораў.

Першая яе пастаноўка ў 1957 годзе – знакаміты “Крыжачок”, які пасля выконвалі шматлікія танцавальныя калектывы нашай рэспублікі. А далей – “Лявоніха”, “Беларуская полька”, “Цудоўная жалейка”, “Перапёлачка”, “Полька-трапятуха”, “Абэрак”, “Кірмаш”, “Мяцеліца”, “Лянок”, “Юрачка”, “Таўкачыкі”, “Мікіта” і шмат іншых.

Вялікім поспехам карысталіся вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі на музыку беларускіх кампазітараў: “Сонца яснае ўзышло”, “Залатыя каласы”, “Колькі ў небе зор”, “Нёманская рапсодыя”, “Танец з шалікамі” на музыку Ю. Семянякі і іншыя. У кожнага танца, пастаўленага Л.Д. Ляшэнка, свае прыёмы, свае асаблівасці.



Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя
“Нёманская рапсодыя”.1962 г.

Свае рэпетыцыі Ляшэнка Л.Д. ніколі не зводзіла да механічнай шліфоўкі патрэбных харэаграфічных рухаў. Яна заўсёды імкнулася да таго, каб як мага лепш, глыбей раскрыць ідэю танца, вобраз, унутраны свет героя кампазіцыі, каб харэаграфічныя кампазіцыі заўсёды вызначаліся шматфігурнасцю, яркасцю малюнка.

Да паездкі ў Маскву, дзе ансамбль выступаў на сцэне Крамлёўскага Палаца З’ездаў, Л.Д. Ляшэнка падрыхтавала танец “Беларуская мяцеліца”. Поспех “Беларускай мяцеліцы” быў незвычайны. Твор гэты назвалі “трыумфам беларускага народнага танца”. Танец зачароўвае сваёй жыццярадаснасцю, імклівай сілай, багаццем малюнка і стройнасцю кампазіцыі.

Сапраўды, танцы “Нёмана” – яскравая, маляўнічая “Лявоніха”, напоўненая радасцю і весялосцю зімовага свята “Беларуская мяцеліца” ці імклівая, віхравая “Полька” - пакінулі ў масквічоў найлепшыя ўражанні. Адзначаліся таксама імкненні калектыву адлюстроўваць у танцы новыя падзеі сённяшняга жыцця. Таму такія станоўчыя водгукі падчас гастроляў атрымалі вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі “Залатыя каласы”, “Колькі ў небе зорак”.

Вельмі цёпла прымалі заўсёды гледачы карагод “Залатыя каласы” на музыку гродзенскага самадзейнага кампазітара Яўгена Петрашэвіча. Дарэчы, задумка пастаноўкі “Залатых каласоў” была звязана з адной з гастрольных паездак у Маскву, калі гуляючы па цэнтральнай алеі ВДНГ, Ларыса Дзмітрыеўна вырашыла паставіць на сцэне карагод на тэму жніва і сельскагаспадарчай працы.

Як народны беларускі танец мае сваё нацыянальнае аблічча, самабытныя рысы, так і кожны танец Ляшэнка нясе адбітак яе таленту, характару, светапогляду, тэмпераменту...

Нават у танцах у 50-70-я гады панавала савецкая ідэалогія. Былі “заказы” – такія, як “Рэвалюцыйны танец” на музыку Рахманінава. Ды і ў астатнім нельга было парушаць “табу”. Але сапраўдны майстар заўсёды знойдзе магчымасць выразіць сябе, свой унутраны свет. У часы любой ідэалогіі можна разглядзець талент і бяздарнасць.



“Нёман” на танцавальнай пляцоўцы Прыроды…

Танцы, пастаўленыя Ларысай Дзмітрыеўнай Ляшэнка былі выдадзены ў двух кнігах, якія выйшлі ў 1982 і 1985 годзе ў Маскве і мелі назвы “Мяцеліца” і “Полькі-рассыпухі”.



МЕТЕЛИЦА



Хореограф – Л.Ляшенко, заслуженный деятель искусств БССР

Запись танца – И.Спиридонова

Музыка – народные мелодии

Художник – Е.Жернакова

Хореографическая композиция М е т е л и ц а – игровая веселая картинка, созданная на материале белорусского народного танца.



Вокладка выдання танцаў у пастаноўцы Л. Ляшэнка

В сборник вошли 2 вокально-хореографических композиции /"Рассыпухи-польки" и "Метелица"/ из репертуара народного ансамбля песни и танца "Неман" Гродненского ГДК.

## РАССЫПУХИ-ПОЛЬКИ

Постановка Л.Ляшенко

Запись Л.Ляшенко
И.Спиридоновой

Вокально-хореографическая композиция "Рассыпухи-польки" построена на элементах белорусских полек, бытующих в Гродненской области.

Композиция состоит из вступления и семи основных фигур: "Выходка", "Падеска", "Пагонна", "Полька под ногу", "Паважна", "Полька по-шляхетски", "Ах ты, полечка-трясуха".

Хореографическая композиция "Рассыпухи-польки" в основном исполняется в быстром темпе, и наиболее интересными являются части танца, построенные на парном исполнении движений.

Каждая фигура объявляется любым участником в начале фигуры. Исполняют композицию 10 девушек и 10 юношей.

Композиция сопровождается хоровой группой и оркестром народных инструментов.

Для удобства разбора записи танца пары пронумерованы в четвертой и пятой фигурах.

Музыка народная. Музыкальный размер всех фигур 2/4.

© Республиканский научно-методический центр народного творчества и культурно-просветительной работы

Апісанне танца для выдання зборніка Л. Ляшэнка Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы [з аўтографам харэографа]

## Зала №9. “Характар”

Паводле прызнання Ларысы Дзмітрыеўны, у дзіцячыя гады яна была хуліганкай і завадатаркай шматлікіх “акцый пратэсту”, як у школе, так і на вуліцы сярод аднагодкаў. Яе настойлівасць і мэтанакіраванасць, цвёрды характар, сфарміраваныя ў дзяцінстве, праявіліся пазней, калі яна працавала ў тэатрах музычнай камеды. Таварышы па службе называлі яе “арлоўскай рысачкай”.

Таленту заўсёды цяжэй ужывацца ў любым асяроддзі. Магчыма па гэтай прычыне, гладкага жыццёвага шляху ў Ларысы Ляшэнка ніколі не было. У пачатку 80-х гадоў не па сваёй волі ёй прыйшлося пакінуць “Нёман”. Праз чатыры гады, пасля ўгавораў, вярнуцца. А ў 1996 годзе яна зноў пакінула свой ансамбль: не апускалася да высвятлення адносін, “павярнулася і пайшла”...

Але не такі быў характар у Ларысы Ляшэнка, не магла яна доўга заставацца без спраў. Падалася ў Гарадскі дом культуры ствараць маладзёжную танцавальную рок-групу. Яе студэнткі танцавалі “Канкан” і танец з балету “Мая цудоўная лэдзі”. На стварэнне касцюмаў па ўласных эскізах яна парэзала ўсе цюлевыя фіранкі ў кватэры і некалькі асабістых сукенак.



Заслужаныя дзеячы культуры Беларусі, вядомыя, слаўныя, шаноўныя працаўнікі на ніве культуры і мастацтва

***Адам Сідаравіч Чопчыц і Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка. Фота 1994 г.***

Уражвала гледачоў і яе пастаноўка сучаснага танца “Павук”. У чорным трыко і чорнай масцы, у павуцінні, з вялізнымі лапамі мітусіцца па сцэне яго герой. Цяжка ўявіць, што харэографу танца – больш за восемдзесят...



“Цудоўны свет,
цудоўнае жыццё!”

У свае восемдзесят Ляшэнка Л.Д. без цяжкасці дэманстравала танцавальныя “па” і кіравала рок-групай!

У адным з апошніх інтэрв’ю Ларыса Дзмітрыеўна падзялілася сакрэтам даўгалецця:

-Ён – у руху! А яшчэ я заўсёды імкнуся да жыцця і ніколі не ныю.

Вось спосаб вытрываць усе выпрабаванні лёсу.

Ларыса Ляшэнка валодала адначасова здольнасцямі мастака і мадэльера. Шматлікія касцюмы для танцаў яна распрацоўвала сама, увасабляла іх у колеры на паперы, ствараючы цудоўныя эскізы. А ў вольную часіну любіла проста маляваць пейзажы ці нацюрморты, якія вызначаліся вытанчанасцю і лёгкасцю.

У штодзённым жыцці Лярыса Ляшэнка была вельмі сціплай, добрай і спагадлівай да людзей.

На працягу ўсяго жыцця побач з ёй заўсёды былі цікавыя і таленавітыя людзі, аднадумцы, якія заставаліся пры гэтым яе блізкімі сябрамі: іспанец-харэограф Херрарда Віано, беларускі харэограф Янка Хвораст, кампазітары Аляксандр Шыдлоўскі і Яўген Петрашэвіч, педагог-музыкант Адам Чопчыц...

Жыла Ларыса Дзмітрыеўна апошнія гады адна ў невялікай кватэры па завулку Даватара: муж памёр, сын з сям’ёй – у Маскве. Пісала вершы, іграла на фартэпіяна, шмат чытала. Гаварыла: “Усё жыццё вельмі любіла кнігі, але толькі зараз з’явіўся час, каб іх чытаць. Чытаю па-руску, па-беларуску, па-польску”.

На жаль, ні сын, ні ўнук, ні праўнук не працягваюць справу маці і бабулі. Яны вайскоўцы. Але маюць добры музычны слых, спяваюць.

У сакавіцкія дні 2004 года шматлікія вучні, калегі і сябры віншавалі Ларысу Дмітрыеўну з 90-годдзем.

А ўжо праз некалькі месяцаў яе не стала...

Танцорка, балетмайстар, музыкант, мастак, паэтэса і кампазітар, – вось такой шматграннай асобай была Ларыса Ляшэнка. На жаль, цяпер ужо можам сказаць толькі “была”. І дадаць: і засталася ў памяці... Магчыма, вось такой маладой і прыгожай, таленавітай і энергічнай, як на гэтым фотаздымку 50-гадоў...



## Зала №10. “Пасляслоўе”

Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка зрабіла вялікі ўклад у развіццё беларускай харэаграфіі. Яе танцы ў выкананні ансамбля “Нёман” пабачылі народы розных краін свету. Яны ўсюды паказвалі прыгажосць душы беларускага народа і праслаўлялі Беларусь.

За заслугі ў развіцці беларускай харэаграфіі і папулярызацыю беларускіх народных танцаў Ларысе Ляшэнка прысвоена ганаровае званне “Заслужаны дзеяч культуры БССР” у 1964 годзе. У 1959, 1968 і 1978 гадах Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.



“На сцэне – слаўны юбіляр...”
Вечар-шанаванне да 80-годдзя
Л.Д. Ляшэнка [сакавік 1994 года]

# *Лариса Дмитриевна Ляшенко*
# *в воспоминаниях современников...*

***Вспоминает*** *Кляшень Маргарита Петровна,*

***артистка ансамбля песни и танца “Нёман”***

Есть люди, общение с которыми оставляет в душе глубокий след и добрую память на всю жизнь. Именно к таким людям относится Лариса Дмитриевна Ляшенко.

Я увидела её впервые где-то в 1946-1947 годах. В то время я занималась в балетной студии при филармонии у И. Хвороста, а Лариса Дмитриевна вела там танцевальный кружок. Я думаю, что это было началом её деятельности, как хореографа. Мы, дети, смотрели на неё, как говорится, во все глаза: молодая, энергичная, с яркой внешностью, а, главное, “здорово” танцевала. Потом И. Хвороста пригласили в Минск, студия распалась. Через какое-то время я узнала, что идёт набор в старшую группу танцевального кружка при Доме пионеров. Со школьной подружкой я пришла в Дом пионеров и там встретила Ларису Дмитриевну. Мы были приняты в кружок.

На занятия Лариса Дмитриевна приходила всегда подтянутой, собранной, с доброй улыбкой. Она стала для нас образцом для подражания. Мы относились к ней, как к старшей сестре или подруге, - всегда делились секретами, могли поплакаться в “жилетку”. И для каждой из нас у неё находилось доброе слово, улыбка, одобрение, сочувствие.

К занятиям Лариса Дмитриевна относилась очень серьёзно, была требовательна, тактична и никогда никого не обижала. Она учила нас понимать музыку и красоту движений, учила общению с людьми, упорству в работе. Заниматься с ней было интересно, мы уже многое умели делать.

Однажды Лариса Дмитриевна, придя на занятия, объявила: “Будем ставить балет “Снегурочка”. Все, конечно, обрадовались. Заняты в балете были все дети. И тут открылся ещё один дар Ларисы Дмитриевны – режиссура. Было интересно наблюдать, как рождается балет. Вместе с подбором музыки Лариса Дмитриевна распределяла роли и выяснилось, что она очень хорошо изучила наши возможности, характеры, и каждый получил то, на что был способен. Я, например, стала Бобылём, т.к. в те годы была добрым сорванцом. Лариса Дмитриевна работала и со всеми вместе, и с каждым отдельно. Объясняла характерные особенности каждого персонажа, показывала как выполнять движения, чтобы подчеркнуть эти особенности. Она всё время повторяла: “Вы не должны просто танцевать, вы должны обыграть каждое движение, чтобы зрителям было понятно, кто есть кто не только по костюмам, вы должны создавать образ”.

У нас были не только занятия в классе и репетиции, но и беседы в минуты отдыха и, даже, маленькие праздники. Помню как на один из Дней рождения Лариса Дмитриевна накрыла для нас сладкий стол, а мы преподнесли ей цветы, открытки, маленькие подарки. Все мы много смеялись, танцевали. Лариса Дмитриевна рассказывала смешные истории из своей сценической деятельноти, а мы - о маленьких казусах на наших концертах. Получился настоящий праздник.

Общаться с Ларисой Дмитриевной я продолжала и потом, когда стала взрослой. Я уже работала в сельской школе учительницей. В те времена много внимания уделялось художественной самодеятельности. Вот я и занялась постановкой танцев с детьми и молодёжью. Мне это удавалось, и в этом большую роль сыграла Лариса Дмитриевна. Приезжая изредка в Гродно, я обязательно советовалась с ней, а она охотно делилась со мной своими знаниями.

Время шло, и я перебралась работать в Гродно. Однажды я встретилась на улице с Ларисой Дмитриевной, она заговорила о недавно созданном ансамбле песни и танца "Неман", и я сразу окунулась в атмосферу благожелательности и понимания. Танцевальный коллектив был молодым: студенты, учителя, служащие.Лариса Дмитриевна осталась такой же молодой (годы не имели власти над ней), энергичной, деятельной. Была в полном расцвете сил, как хореограф. Работы у неё было много: постановка танцев и танцевальных сюит, подборка костюмов, преподавание в культпросветучилище, концерты, позднее поездки с концертами по стране и в зарубежье, съёмки в кино и на телевидении, постановка хореографических сцен в Гродненском театре.

А танцы! Они всегда пользовались успехом у зрителей. В них был талант и душа Ларисы Дмитриевны, любовь и огромный труд. Искромётная "Лявониха" и оригинальная "Козочка", молдавские, испанские, польские, украинские танцы и, конечно, "Метелица", которая очень долго держалась на сцене. Была и постановка "Вальпургиевой ночи". Я в ней уже не участвовала, так как покинула "Неман", но видела её на сцене. Прекрасное сочетание музыки Гуно и движений, созданных Ларисой Дмитриевной.

Я иногда бывала у Ларисы Дмитриевны дома. С ней интересно всегда: разговаривать или просто слушать её истории. Темы разные: о жизни, кинофильмах, книгах, танцах. Иногда вспоминали отдельные события из жизни Ларисы Дмитриевны. От этих воспоминаний становилось немного грустно, но эта грусть была прекрасна, ибо не всем дано всю свою жизнь посвятить любимому делу. А Лариса Дмитриевна может сказать: "Танец – это моя жизнь!"

Конечно, у Ларисы Дмитриевны были и взлёты, и падения, и радости, и горести, как в личной жизни, так и в творчестве. Но она всегда была жизнерадостной, стойкой, терпеливой, доброй, скромной. Для меня Лариса Дмитриевна - человек с большой буквы и всегда таким останется.

2003 год

# *Лариса Дмитриевна Ляшенко в воспоминаниях современников...*

## *Вспоминает Шевалье Игорь Александрович, преподаватель Гродненского культпросветучилища*

Познакомился я с Ларисой Дмитриевной Ляшенко в 1947 году в городе Слониме.

Ансамбль Г. Ширмы в Слониме давал концерт в Доме офицеров для личного состава 8-го Краснознамённого Ордена Кутузова механизированного Александрийского корпуса. Лариса Дмитриевна вместе с Иваном Хворостом исполняли танец. Танец прошёл на бис, их очень долго не отпускали со сцены.

Я жил рядом с Домом офицеров, и после концерта мы с женой пригласили Ларису Дмитриевну в гости. С того времени и началась наша дружба.

Потом много лет я работал с Ларисой Дмитриевной в нашем Гродненском культпросветучилище.

Лариса Дмитриевна - человек-творец, человек-созидатель, которая всю свою жизнь посвятила искусству, сеяла разумное, доброе, вечное.

В том, что ансамбль «Неман» существует и процветает, - огромная заслуга Ларисы Дмитриевны. Она являлась его организатором и много-много лет отдавала себя творчеству, руководству ансамблем «Неман», а потом передала его своим ученикам. Ларису Дмитриевну очень любили и любят её ученики.

Ансамбль «Неман» появился в 1957 году. Нас вызвала Емельянова и поставила задачу срочно создать ансамбль, так как по приглашению польского ансамбля «Курки зелёные» наш ансамбль должен был поехать в Польшу на гастроли. Так появился «Неман».

2003 год

# *Подборка стихов*

# *Ларисы Дмитриевны Ляшенко*

## ЛЕС

Вот и лес со своею дубравой,
Под окном он шумит у меня.
И берёзка, как мальчик кудрявый,
Шепчет, гнётся, как будто маня.

Придёт ночь и таинственной
мглою
Лес обнимет, кругом тишина.
Хорошо мне, прижавшись с тобою,
Посидеть, да свидетель - луна.
Сколько видит она, сколько знает
Самых скрытых от мира чудес,
Хорошо, и она понимает,
Что дойдём мы до лунных небес.

Октябрь 1994 г.

## МОЛОДЁЖЬ

Молодёжь – задорная, простая,
С огоньком весёлым и в труде,
Я люблю тебя за то, что ты такая
Молодая, яркая везде.

Но бывает, тучка грозовая
Набежит на «неманцев» чело,
И тогда мне грустно так бывает,
Что не хочется же, право, ничего.

Вы даёте людям счастье, радость,
Поднимая вверх культуры флаг.
Гордо вы стоять должны, не падать,
И шагать, продумав каждый шаг.

Искры радости, веселья разнесите,
В танцы, окунувшись с головой.
Ну, а мне, родные, разрешите
Оставаться с вами молодой.

***********

Всколыхнула тихую заводь
Моей жизни, приехав сюда,
Буреломом прошли пред глазами
Все страницы былого житья.

Я ценю твой порыв и желанье
Повидать меня, старый мой друг,
Не прощай, я скажу – до свиданья,
Не закрылся ведь жизненный круг.

1961 г.

***************

В своих мыслях хочу разобраться,
Разложить по частям свою душу,
Но должна я при этом сознаться:
Уголок есть, который нарушу.

Уголок этот слишком укромный,
Всё, что хочешь, находится в нём
А для чуждого глаза – он тёмный:
Ничего не найдёшь, даже днём.



*Стихи и музыка Л.Д. Ляшенко*

## СЫНОВЬЯ

*Песня*

**Сыновья, пожалейте старых матерей,**
**Берегите вы их головы седые,**
**Будьте ласковее с ними и добрей,**
**Они для вас ведь самые родные.**
**Припев:**
**А ласковое слово,**
**Оно их души лечит,**
**Ведь ласковое слово**
**Для них, как эликсир.**
**От ваших тёплых слов**
**Они воскреснут снова,**
**Для них ведь сыновья -**
**Единственный кумир.**

**Если мать иногда что-то скажет не так,**
**А вам, может быть, и хотелось иначе,**
**Промолчите, простите за этот пустяк,**
**В жизни есть посложнее задачи.**
**Припев.**
**Дорогие мои, ненаглядные детки,**
**Вам об этом подумать надо всерьёз.**
**Слышать грубость, упрёки очень не редки,**
**А глаза матерей полны искренних слёз.**
**Припев.**

# Бібліяграфія


1. Ларыса Дзмітрыеўна Ляшэнка [Тэкст] // Заслужаныя дзеячы і работнікі культуры Гродзеншчыны: нарысы. - Гродна, 1999. - С. 22-23.
2. Гололобова, Л. В танце – через всю жизнь… [Текст]: [Л.Д. Ляшенко – 90 лет] / Л. Гололобова // Гродзенская праўда. - 2004. - 20 сак.
3. Костин, В. Расцветать народным танцам [Текст] / В. Костин // Гродзенская праўда. - 1964. - 22 сак.
4. Кухаронак, Т. Ларыса Ляшэнка, чый лёс і прызванне – танец [Тэкст] / Т. Кухаронак // Культура. - 1999. - 10-16 ліп. (№25). - С. 4.
5. Михайлова, И. Жизни навстречу [Текст]: [к 50-летию Л.Д. Ляшенко] / И. Михайлова // Гродзенская праўда. - 1964. - 14 сак.
6. Нисевич, И. О творчестве начинающих композиторов Гродненщины: [в том числе, о Л.Д. Ляшенко] [Текст] / И. Нисевич, Р. Пукст // Гродзенская праўда. - 1951. - 8 мая.
7. Новицкая, Л. В свои восемьдесят она демонстрирует танцевальные па и руководит рок-группой [Текст] / Л. Новицкая // Гродзенская праўда. - 1997. - 6 сак.
8. Шыдлоўскі, А. Шчодры талент [Тэкст]: [Л.Д. Ляшэнка – 80 год] / А. Шыдлоўскі // Гродзенская праўда. - 1994. - 26 сак.

# ЗМЕСТ

**Уступ-----------------------------------------------------------------1**

**Зала №1 "Дзяцінства"--------------------------------------------2**

**Зала №2 "Юнацтва"-----------------------------------------------5**

**Зала №3 "Каханне і выпрабаванні"---------------------------7**

**Зала №4 "Вайна"---------------------------------------------------9**

**Зала №5 "Гродна"-------------------------------------------------11**

**Зала №6 "Нёман"--------------------------------------------------17**

**Зала №7 "Вучні"----------------------------------------------------23**

**Зала №8 "Танец"----------------------------------------------------26**

**Зала №9 "Характар"----------------------------------------------31**

**Зала №10 "Паслясл оўе"-------------------------------------------34**

**Л.Д. Ляшенко в воспоминаниях современников ---------35**

**Подборка стихов Л.Д. Ляшенко ------------------------------38**

**Бібліяграфія ------------------------------------------------------40**

**"Жыццё, як бліскавіцы міг...": заслужаны дзеяч культуры Беларусі Л.Д. Ляшэнка: нарыс аб жыцці і творчасці / Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна; аддзел бібліятэчнага маркетынгу і рэкламы цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка; склад. і рэд. Свірыда Н.Р., адк. за вып. Рыбалка Г.І. - Гродна, 2009. - 36 с.**

Нарыс напісаны па матэрыялах з перыядычных выданняў. Выкарыстаны фотаздымкі і дакументы з асабістага архіву жанчыны. Матэрыял нарыса згрупаваны па раздзелах згодна з умоўным падарожжам-экскурсіяй па "залах музею жыцця Творцы".

**Складальнік і рэдактар: Свірыда Н.Р.**
**Камп'ютэрны набор і афармленне:**
**Свірыда Н.Р.**
**Адказны за выпуск: Рыбалка Г.І.**
**Наклад: 2 экз.**